**Варапаева В.С.,** *прафесар*

# ЛІТАРАТУРНАЕ РАЗВІЦЦЁ СТУДЭНТАЎ: РЭАЛЬНАЦЬ І ПЕРСПЕКТЫВЫ КУЛЬТУРАЛАГІЧНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ

З кожным годам усё менш сустракаецца студэнтаў, якія глыбока разумеюць літаратуру як від мастацтва. Гаворка аб прачытанай кнізе часцей за ўсё зводзіцца да простага яе пераказу. Не адчуваюцца стыль, манера пісьма аўтара, выяўленчыя сродкі, якімі ён карыстаецца, не разумеецца ўмоўнасць мастацтва, няма ў чытачоў сваіх думак пра твор. Калі сярод практыкаў мастацтва само сабой разумеецца, што пісьменнік, паэт — гэта «мастакі слова», а літаратура — адно з мастацтваў, дык у педагагічнай тэорыі і практыцы літаратура адасоблена ад іншых мастацтваў. Хаця яна і займае ў школе больш пачэснае месца, чым музыка ці выяўленчае мастацтва, але яе мастацкая сутнасць забываецца, бадай, больш часта. А ўжо пра тое, каб дзіцяці паспрабаваць асабістыя сілы ў літаратурнай творчасці, і гаворкі няма.

А між тым літаратура ў адпаведнасці са сваімі функцыямі (эстэтычнай, выхаваўчай, адукацыйнай, камунікатыўнай) аказвае значны ўплыў на станаўленне і развіццё асобы: фарміруе погляды, выхоўвае пачуцці, развівае эмацыянальную сферу, дае магчымасць павярнуць школьніка на шлях гуманітарнага мыслення, разумення агульначалавечых каштоўнасцей. Усё гэта магчыма пры ўмове падыходу да яе менавіта як да віду мастацтва.

Таму ў новай канцэпцыі літаратурнай адукацыі школьнікаў мы і разглядаем літаратуру, па-першае, не столькі як звычайны вучэбны прадмет, колькі як мастацтва, як галіну мастацкай (у тым ліку і дзіцячай) творчасці; па-другое, як адно з мастацтваў у яго непарыўнай сувязі з іншымі. І не ў сэнсе традыцыйных



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

міжпрадметных сувязей, часта знешніх, а з пункту гледжання глыбіннай роднасці мастацтваў, адзінства іх паходжання, агульнасці ўздзеяння на чалавека, агульнасці асноўных заканамернасцей стварэння і ўспрымання мастацкіх вобраза. А гэта дае падставу сур'ёзна ставіць і пытанне аб адзінтве прынцыпаў і метадаў выкладання розных мастацкіх дысцыплін. Відаць, самае галоўнае ў гэтым працэсе вось што: як у дзіцяці з самага ранняга ўзросту мы фарміруем здольнасці бачыць у сабе чалавека, так і ў мастацтве, у прыватнасці ў літаратуры, неабходна вучыць яго адчуваць і бачыць аўтара.

Безумоўна, фундамент літаратурнай адукацыі, літаратурнага развіцця школьніка закладваецца ў пачатковай школе. Менавіта тут доўгія гады існавала «тлумачальнае чытанне», задача якога зводзілася да выпрацоўкі навыкаў чытання і элементарнага тлумачэння тэкстаў. Сам тэрмін «тлумачальнае чытанне» не адпавядаў прыродзе літаратуры. Таму і атрымлівалася, што тыя літаратурныя жанры, якімі былі насычаны вучэбныя кнігі, разглядаліся на ўроку як дадатак да прыродазнаўства, азнаямлення з навакольным светам і г.д. З такім становішчам мірыцца было нельга. І таму ў новай канцэпцыі літаратурнай адукацыі малодшых школьнікаў прапанаваны новы тэрмін «літаратурнае чытанне».

На чым заснавана літаратурнае чытанне? Навучанне разуменню літаратуры як віду мастацтва будуецца на зліцці мысліцельных і тэхнічных працэсаў у адзіную моўнамысліцельную, інтэлектуальную і духоўную дзейнасць: чытаць — адчуваць — разумець — тварыць. Усе прыёмы навучання заснаваны на разуменні псіхалогіі вучня, асаблівасцей яго ўспрымання, схільнасцей, здольнасцей і ўзгоднены з прыродаю вывучаемага прадмета.

Зыходзячы з таго, што ў пачатковай школе дзеці сустракаюцца часцей за ўсё з двума відамі літаратуры (мастацкай і

навукова-пазнавальнай), мы прапануем і два віды літаратурнага чытання: лагічнае, калі гэта тычыцца навукова-пазнавальных твораў, і эстэтычнае, сугучнае прыродзе мастацкай літаратуры. Задача лагічнага чытання — выяўленне розных часавых, прычынна-выніковых сувязей апісаных з'яў, паслядоўнасці падзей, фактаў, сутнасці рэчаў, прадметаў. Менавіта лагічнае чытанне дае падставу для набыцця пэўных ведаў.

Эстэтычнае ж літаратурнае чытанне накіравана перш за ўсё на абуджэнне і развіццё ў дзяцей эмацыянальнай сферы, выхаванне пачуццяў, развіццё вобразнага мыслення і творчых здольнасцей; яно звязана з разуменнем мастацкага твора ў адзінстве формы і зместу, успрыманнем яго вобразнай канкрэтнасці і мастацкага абагульнення.

Самае галоўнае і спецыфічнае — далучыць дзіця да чытання і разумення літаратуры як віду мастацтва праз асабістую творчасць: драматызацыю, вуснае славеснае маляванне, складанне дыяфільмаў, вершаў, казак, апавяданняў, загадак, прымавак і інш. Пры гэтым важна сканцэнтраваць увагу на развіцці эмоцый у дзяцей. Практыка паказвае, што ў большасці дзяцей эмацыянальная сфера неразвіта. Сёння яны больш накіраваны на лагічнае пазнанне: камп'ютэрныя гульні, тэлевізар. Гэта адчуваецца і ў тым, як дзеці фантазіруюць. Прыдумаць гульню самім ім вельмі цяжка. А гуляць іх трэба вучыць, бо без гэтага немагчыма творчасць.

Галоўнай асаблівасцю методыкі літаратурнага чытання з'яўляецца тое, што на ўроку арганізуецца калектыўны пошук творчага спасціжэння літаратуры, ствараюцца ўмовы для свабоднага самавыяўлення вучняў. Заданні накіраваны на развіццё іх творчых сіл, фантазіі, асацыятыўнага маслення, мовы, здольнасці параўноўваць асобныя творы і г.д. Вучні прывучаюцца рабіць назіранні над выяўленча-выразнымі сродкамі мовы, выкарыстанымі пісьменнікам пры стварэнні мастацкіх

вобразаў, успрымаюць мастацкі твор праз яго інтанацыю, тон, мелодыку мовы. На ўроку літаратурнага чытання практыкуюцца заданні, якія накіраваны на развіццё літаратурных здольнасцей у дзяцей:

Ты кампазітар! Паспрабуй уявіць,
Якой павінна быць музыка да гэтага твора!
Ты скульптар! Які помнік паставіш герою?
Знайдзі рыфмаваныя радкі, прыдумай свае;
па парных словах прыдумай сваё апавяданне,
па серыі малюнкаў прыдумай казку і г.д.

Асаблівае значэнне ў рабоце з мастацкім творам надаецца выразнаму чытанню тэксту, якое дапаможа дзіцяці больш эмацыянальна ўспрыняць прачытанае, паглыбіць яго разуменне, даць ацэнку героям і падзеям. У пачатковай школе ўпершыню мы распрацавалі сістэму выразнага чатання і ўвялі яе ў падручнікі (серыя «Радуга»). Дзеці тэарэтычна і практычна асэнсоўваюць паняцці: правільнае дыханне, голас, дыкцыя, вымаўленне галосных, зычных гукаў, асобных граматычных формаў, мелодыка мовы, тэмбр, тэмп, рытм, лагічны і фразавы націск, лагічныя і псіхалагічныя паўзы. На падставе гэтых ведаў дзеці вучацца выразна чытаць творы розных жанраў.

Літаратурнае развіццё малодшых школьнікаў здзяйсняецца і праз  сістэму ведаў пра літаратуру і яе спецыфіку. Ужо ў другім класе дзеці атрымліваюць на даступным матэрыяле паняцці пра разнастайныя жанры літаратуры: песні, пагаворкі, забаўлянкі, прымаўкі, народныя і літаратурныя казкі. У трэцім і чацвёртым класах жанры і паняцці больш складаныя: байкі, паданні, апавяданні; аўтар, герой і г.д.

Увага настаўнікаў накіроўваецца на тое, каб яны дапамагалі дзецям услухоўвацца, углядацца ў мастацкі твор, выпрацоўваць свой погляд на яго. Галоўнае — не навязваць тое, што думаеш сам, і не чакаць пры гэтым такіх адказаў, як бы адказаў сам.

Мы спадзяемся, што такая сістэма работы з літаратурнымі творамі ў пачатковай школе дазволіць стварыць моцную базу для далейшага разумення дзяцьмі літаратуры як віду мастацтва.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ